ШЫФР __________

# РАЁННАЯ АЛІМПІЯДА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры

**2018 год** **8 клас**

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго | Вынік |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Укажыце колькасць пазначаных гукаў у прапанаваных сказах.**

| Сказ | Гук | Колькасць |
|---|---|---|
| 1) Каласок да каласка – і зараз жа снапоў сціртa. | [с] | |
| 2) Без галавы, што без рук. | [а] | |
| 3) Каб не ежка ды адзежка, была б грошай поўная дзежка. | [ш] | |
| 4) Не адцягнеш як ката ад мышы. | [т] | |
| 5) Людзі і сякерай голяцца, а мы і брытвай не ўмеем. | [й] | |
| 6) Калі дзед – ёсць і абед, няма дзеда – няма і абеда. | [д] | |
| 7) Не скачы на высокія горы, бо на нізкія сядзеш. | [с] | |

**Заданне 2. Устаўце літары е, ё ці я і запішыце назоўнікі ў форме роднага склону адзіночнага ліку.**

Плац…ж – ____________________________________,
Сакава…ж – ____________________________________,
Дубл..р – ____________________________________,
Граб…ж – ____________________________________,

Камуфл…ж – ________________________________,
Чарц…ж – _________________________________.

**Заданне 3. Да наступных прыметнікаў-паронімаў дапасуйце адпаведныя назоўнікі.**

| | |
|---|---|
| Адборачны (1), адборны (2) | гатунак ( ), этап ( ), насенне ( ), спаборніцтвы ( ), войскі ( ), камісія ( ), праверка ( ), бульба ( ) |
| Балотны (1), балоцісты (2) | птушка ( ), луг ( ), мясцовасць ( ), вада ( ), нізіна ( ), вільгаць ( ), расліна ( ), бераг ( ) |
| Вавёркавы (1), вавёрчын (2) | хвост ( ), футра ( ), дупло ( ), нарыхтоўкі ( ), каўнер ( ), шапка ( ), зубкі ( ), мордачка ( ) |
| Жыллёвы (1), жылы (2) | будынак ( ), фонд ( ), аддзел ( ), камісія ( ), праблема ( ), дом ( ), раён ( ), памяшканне ( ) |

**Заданне 4. Падкрэсліце словы, якія складаюцца з пяці марфем.**

Нагаварыцца, абагравальнік, абясцэньваць, раздвоены, затуханне, абясшкодзіць, аб’яўляцца, паўнаводны, паслабленне, вывучаны, нарасказваць.

**Заданне 5. Выпішыце нумары прыкладаў, у якіх правільна пададзены адпаведнікі да рускіх фразеалагізмаў.**

1. Кот наплакал – як вароне на хвасце панесці;
2. Одним миром мазаны – усе чэрці адной шэрсці;
3. Ни зги не видно – ні складу ні ладу;
4. Как ни в чём не бывало – як Піліп з канапель;
5. От горшка два вершка – кату па пяту;
6. И дело с концом – і дуды вобземлю;
7. Как белка в колесе – як на вуголлі;
8. Ни за что ни про что – з ласкі на пацеху;
9. Бить баклуши – біць байды;
10. А хоть бы хны – не мецць клёку ў галаве.

**Адказ:** ______________________________________

**Заданне 6. Запішыце словазлучэнні па-беларуску.**

Жить по соседству – ______________________________________________

По своему происхождению – ________________________________________

Отправить за доктором – __________________________________________

Моложе сестры – _________________________________________________

Простите меня – _________________________________________________

Три раза в неделю – ______________________________________________

Экскурсии по воскресеньям – ______________________________________

Болеть ангиной – ________________________________________________

Отправить по адресу – ____________________________________________

Идти мимо музея – _______________________________________________

**<u>Заданне 7.</u> Пастаўце на месцы пропускаў, дзе неабходна, працяжнік.**

1. Яму ўжо ___ гадоў за пяцьдзясят. 2. Складаны чалавек ___ гэты Кандрат. 3. Шыр, прастор ___ вокам не ахапіць! 4. Адзін у полі ___ не воін. 5. Наша Зямля ___ гэта планета, а Сонца ___ зорка. 6. Дзве трэція агарода ___ бульба. 7. Уся сцяна ___ нібы шкляная. 8. Воднае пола, або ватэрпол, ___ алімпійскі від спорту. 9. Рак ___ не рыба, кажан ___ не птушка. 10. Прыемнае слова ___ вясновы дзень.

**<u>Заданне 8.</u> Запішыце мінімальныя кантэксты, у якіх сказ** *“Я пагавару з тваімі бацькамі”* **ў адным выпадку азначаў пагрозу, у другім – суцяшэнне.**

**Пагроза:**

__________________________________________________________

___________________________________________________________
_

___________________________________________________________
_

**Суцяшэнне:**

______________________________________________________

___________________________________________________________
_

___________________________________________________________
_

**<u>Заданне 9.</u> Запоўніце прабелы ў табліцы.**

| № п.п. | Аўтар літаратурнага твора | Назва літаратурнага твора | Від лірыкі |
|---|---|---|---|
| 1. | | “Слуцкія ткачыхі” | |
| 2. | | “Жыццё даецца, каб жыццё тварыць...” | філасофская лірыка |
| 3. | А.Куляшоў | “Бывай...” | |
| 4. | | “О, край родны, край прыгожы!...” | |
| 5. | | “Беларуская песня” | грамадзянская лірыка |

**Заданне 10. Назавіце літаратуразнаўчыя тэрміны па іх азначэннях.**

1. Двухскладовая стапа з націскам на першым складзе ( /__ ___ ) – ______________________________ .
2. Сістэма падзей у апавядальным творы, раскрыццё дзеяння твора і праз яго – характараў герояў – ___________________________________________ .
3. Іншасказанне, мастацкі прыём, калі абстрактная думка раскрываецца праз паводзіны жывёл, асаблівасці раслін, іншых прадметаў ці рэчаў – __________________________________________________ .
4. Сюжэтны верш гераічнага, легендарнага зместу, часта з элементамі фантастыкі ў сюжэце – _________________________________ .

РАЁННАЯ АЛІМПІЯДА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры **(АДКАЗЫ)**

**2018 год** **8 клас**

**Заданне 1.**

| **Сказ** | **Гук** | **Колькасць** |
|---|---|---|
| 1. Каласок да каласка – і зараз жа снапоў сцірта. | [с] | **3** |
| 2. Без галавы, што без рук. | [а] | **3** |
| 3. Каб не ежка ды адзежка, была б грошай поўная дзежка. | [ш] | **4** |

| | | |
|---|---|---|
| 4. Не адцягнеш як ката ад мышы. | [т] | **1** |
| 5. Людзі і сякерай голяцца, а мы і брытвай не ўмеем. | [й] | **5** |
| 6. Калі дзед – ёсць і абед, няма дзеда – няма і абеда. | [д] | **2** |
| 7. Не скачы на высокія горы, бо на нізкія сядзеш. | [с] | **3** |

***(Максімальная колькасць балаў – 7 б. За правільны адказ – 1 б.)***

**Заданне 2.** Плацёж – **плацяжу**, саквояж – **саквояжа**, дублёр – **дублёра**, грабеж – **грабяжу**, камуфляж – **камуфляжу**, чарцёж – **чарцяжа**.
***(Максімальная колькасць балаў – 6 б. За правільны адказ – 0,5 б.)***

**Заданне 3.**

| | |
|---|---|
| Адборачны (1), адборны (2) | гатунак (**2**), этап (**1**), насенне (**2**), спаборніцтвы (**1**), войскі (**2**), камісія (**1**), праверка (**1**), бульба (**2**) |
| Балотны (1), балоцісты (2) | птушка (**1**), луг (**2**), мясцовасць (**2**), вада (**1**), нізіна (**2**), вільгаць (**1**), расліна (**1**), бераг (**2**) |
| Вавёркавы (1), вавёрчын (2) | хвост (**2**), футра (**1**), дупло (**2**), нарыхтоўкі (**2**), каўнер (**1**), шапка (**1**), зубкі (**2**), мордачка (**2**) |
| Жыллёвы (1), жылы (2) | будынак (**2**), фонд (**1**), аддзел (**1**), камісія (**1**), праблема (**1**), дом (**2**), раён (**2**), памяшканне (**2**) |

***(Максімальная колькасць балаў – 8 б. За правільны адказ – 0,25 б.)***

**Заданне 4.** Нагаварыцца, абагравальнік, абясцэньваць, раздвоены, затуханне, абясшкодзіць, аб'яўляцца, паўнаводны, паслабленне, вывучаны, нарасказваць.
***(Максімальная колькасць балаў – 3 б. За правільны адказ – 0,5 б.)***

**Заданне 5.** **Адказ: 1, 2, 5, 6, 8, 9**
***(Максімальная колькасць балаў – 3 б. За правільны адказ – 0,5 б.)***

**Заданне 6.**
Жить по соседству – **жыць у суседстве (жыць суседзямі)**

По своему происхождению – **сваім паходжаннем (паводле свайго паходжання, са свайго паходжання)**
Отправить за доктором – **адправіць па доктара**
Моложе сестры – **маладзейшы за сястру**
Простите меня – **прабачце мне**
Три раза в неделю – **тры разы на тыдзень**
Экскурсии по воскресеньям – **экскурсіі па нядзелях**
Болеть ангиной – **хварэць на ангіну**
Отправить по адресу – **адправіць на адрас**
Идти мимо музея – **ісці паўз музей**
***(Максімальная колькасць балаў – 5 б. За правільны адказ – 0,5 б.)***
**Заданне 7.** Яму ўжо гадоў за пяцьдзясят. 2. Складаны чалавек гэты Кандрат. **3.** Шыр, прастор – вокам не ахапіць! 4. Адзін у полі не воін. **5**. Наша Зямля – гэта планета, а Сонца – зорка. **6.** Дзве трэція агарода – бульба. 7. Уся сцяна нібы шкляная. **8.** Воднае пола, або ватэрпол, – алімпійскі від спорту. 9. Рак не рыба, кажан не птушка. **10.** Прыемнае слова – вясновы дзень.
***(Максімальная колькасць балаў – 5 б. За правільны адказ – 1 б.)***
**Заданне 8.** ***(Максімальная колькасць балаў – 4 б. За правільны прыклад – 2 б. За арфаграфічныя або пунктуацыйныя памылкі здымаецца 0,25 б.)***
**Заданне 9.**

| № п.п. | Аўтар літаратурнага твора | Назва літаратурнага твора | Від лірыкі |
|---|---|---|---|
| 1. | **М.Багдановіч** | “Слуцкія ткачыхі” | **грамадзянская лірыка** |
| 2. | **А.Вярцінскі** | “Жыццё даецца, каб жыццё тварыць...” | філасофская лірыка |
| 3. | А.Куляшоў | “Бывай...” | **інтымная лірыка** |
| 4. | **Я.Колас** | “О, край родны, край прыгожы!...” | **пейзажная лірыка** |
| 5. | **У.Караткевіч** | “Беларуская песня” | грамадзянская лірыка |

***(Максімальная колькасць балаў – 3,5 б. За правільны адказ – 0,5 б.)***
**Заданне 10.** **1. Харэй. 2. Сюжэт. 3. Алегорыя. 4. Балада.**